ЭШС

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

7

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**АДМО́ЎЕ**, выражэнне з дапамогай лексічных і граматычных сродкаў, а таксама інтанацыі значэння процілегласці пэўнаму сцвярджэнню. У беларускай мове А. выражаецца: адмоўнымі часціцамі *не*, *ні*, *ані* (*Не чуваць у садзе птушынага шчэбету*; *На небе ні воблачка*; *У лесе ані гуку*); адмоўнымі займеннікамі *ніхто*, *нішто*, *нічый*, *ніякі*, *нікольki*; адмоўнымі прыслоўямі *нідзе*,

*ніколі, нікольки, нікуды, ніадкуль, ніяк*; безасабова-прэдыкатыўнымі словамі *няма, нельга, немагчыма*; словаўтваральнымі прэфіксамі *не-, ні-, ані-* (*жывы — нежывы, хто — ніхто, дзе — анідзе*); з дапамогай інтанацыі пры экспрэсіўным выражэнні адмоўя ў сцвярджальным сказе (*Так я вас і паслухаў!*).

Адмоўнымі ў беларускай мове з'яўляюцца сказы, у якіх адмаўляецца наяўнасць пэўных з'яў, падзей, дзеяння або стану. Асноўныя сродкі выражэння А. — адмоўныя часціцы і безасабова-прэдыкатыўнае слова *няма*. Адрозніваюць сказы агульнаадмоўныя — А. адносіцца да дзеяслова-выказніка і выражае поўнае адмаўленне з'яў або падзей (*Тыдзень не было дажджу*) і частковаадмоўныя — А. адносіцца да любога члена сказа, акрамя выказніка, і адмаўляе толькі асобныя рысы з'яў або падзей, якія сцвярджаюцца ў сказе (*Дождж ішоў не ўвесь тыдзень*). Калі ў адным сказе А. паўтараецца пры абедзвюх частках састаўнога дзеяслоўнага выказніка або пры 2 членах сказа, то гэты сказ набывае сцвярджальнае значэнне (*Я не магу не падзякаваць вам за дапамогу*). Такое А. называецца падвойным. Слова ці марфема, якія заключаюць у сабе значэнне процілегласці таму, што сцвярджаецца, атрымалі ў лінгвістыцы тэрміналагічнае азначэнне **негацыя** (лац. *negatio*).

*В.В. Урбан.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ